# ТАТА Ў ДЭКРЭЦЕ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Не ведаю, ці змагла б я давярыць сваё дзіця чужому чалавеку... А як вы выбіралі нянечку?***

— Таня нам ужо як свая. Знайшлі яе па рэкамендацыі маіх сяброў. У яе ўласныя дзеці ўжо дарослыя — музыканты. Сама ж яна ўсё жыццё прысвяціла педагогіцы, працавала дырэктарам школы. Яны з Макарам неяк адразу знайшлі агульную мову.

***— А жонка не пакутуе, што магла б больш часу з сынам праводзіць?***

— Ёсць, канешне, крыху. Але яна «адрываецца» ў адпачынку, па выхадных. Па вечарах у мяне часта то трэніроўка (па тайскім боксе. — **Аўт.**), то рэпетыцыя. Дык яны ўдваіх тусуюцца, без мяне. І вельмі ў іх усё добра. Плюс мама заўсёды прыходзіць у абед, каб пабыць з Макарчыкам крыху.

## «Я з квактухамі нават размаўляць доўга не магу»

***— Некаторыя лічаць, што жанчына павінна сядзець дома ды варыць баршчы...***

— О не! Я з квактухамі нават размаўляць доўга не магу. Не буду ж я з імі гаварыць пра боршч пастаянна. Са школы, з музычнага вучылішча мяне акалялі цікавыя, творчыя людзі. Квактух сярод іх не было. Ніводнай. І жонка ў мяне пастаянна развіваецца, ходзіць на розныя курсы, чытае запоем. Яна скончыла ліцэй БДУ, пасля мехмат БДУ, бізнес-школу ІПМ, абаранялася ў Польшчы.

***— Побач з такой жанчынай таксама нельга стаяць на месцы...***

— Менавіта так. Таму мы і рухаемся разам: Іра штосьці даведалася новае, штосьці я, дзелімся сваімі набыткамі, цягнемся адно за адным. Для мяне самае важнае, што нам цікава разам. З квактухамі ж проста: імі можна камандаваць, прыгнятаць. З разумнай жанчынай такі нумар не пройдзе. Але некаторым мужчынам так прасцей: за кошт гэтых «хатніх» жанчын нешта з сябе ўяўляць, самарэалізоўвацца...

***— А як вы пазнаёміліся?***

— На юбілейным канцэрце Apple Tea. Ужо сем гадоў прайшло, як мы разам.

***— Вас з'яднала любоў да музыкі?***

— Не, хутчэй аднолькавыя погляды на жыццё. У размове з тады адразу зразумеў, што ў нас шмат агульнага. А яшчэ мы абое вельмі любім падарожнічаць.

***— Як правіла, вандруеце ўдваіх?***

— Не, цяпер учатырох. З 4 месяцаў пацыху пачалі ўцягваць і Макара. Бабулю таксама бяром з сабой. І нам прасцей, і ёй таксама добра. Палову дня мы з Макарам гуляем. А пасля аддаём Ірынай маці, бяром матацыкл напракат і паехалі катацца. Макар жа яшчэ маленькі, яму трэба паспаць абавязкова днём.

**Лічу, што добра, калі ў садзіку ёсць хоць адзін забіяка, каб іншыя дзеці разумелі, як з гэтым жыць.**

***— У мяне ёсць знаёмы, які прынцыпова адпачывае адзін ці ў мужчынскай кампаніі. Расказваў, як аднойчы ўзяў з сабой жонку на байдаркі, дык яна ўжо праз дзень пачала даймаць размовамі накшталт «як мы будзем дом будаваць?»***

— Іра вельмі шмат працуе, вырашае свае сур'ёзныя задачы ў бізнесе. Яна не можа прыйсці пасля работы і пераключыць адразу ж увагу. Гадзін да дзесяці толькі адыходзіць. Адзіны спосаб ёй «перазагрузіць» мозг, гэта паехаць у адпачынак на тыдзень-два. Таму ні пра якую работу, ні пра якія праблемы мы з ёй там не гаворым.

***— Як у вашай сям'і размяркоўваюцца абавязкі?***

— Я стараюся Іру па-максімуме разгрузіць. У магазін езджу, люблю гатаваць. У мяне такі талент, ад бацькі, напэўна. Жонцы гэта нецікава. Адразу, калі пачалі сустракацца, Іра сказала: «Слухай, я не люблю гатаваць». Для мяне гэта не праблема. Неяк, яшчэ да знаёмства з Ірай, мы ехалі са знаёмым у камандзіроўку. «Ой, я забыўся ўзяць ссабойку», — кажу я. — «А ты што, яе сам збіраеш?» — «Ну, так». «А што, твая дзяўчына не збірае?» — «Не». — «А навошта яна такая наогул патрэбная?» А сэнс жа не ў тым, каб каханая табе ссабойкі збірала і штаны мыла. Я заўсёды быў самастойны, самадастатковы ў гэтым плане. З 17 гадоў жыву адзін, усё раблю за сябе сам. Зараз, праўда, штосьці і Іра за мяне робіць. У прыватнасці, за мыццё бялізны яна адказвае.

## «Сын забараняе мне іграць на гітары»

***— Як звычайна бавіце час з сынам?***

— Я яго ў басейн важу. Гэта мой самы прыемны абавязак.

***— Шмат там татаў з дзецьмі?***

— Апошнім часам так. Прычым майго ўзросту. Відаць, што яны прыходзяць туды не таму, што трэба, а таму, што гэта ім падабаецца. Мне, напрыклад, з Макарам у «жабніку» забаўна. Сам я там, вядома, не змагу нармальна паплаваць. Але вы б бачылі, як мы дурэем з ім, скачам, ныраем. Любім мы ездзіць разам і на рыбалку. Праўда, сынок, любіш ты рыбу лавіць, вудачкай сіняй? У мяне шмат розных, але ён чамусьці заўсёды просіць сінюю. У нас з Ірай заўсёды была дыскусія. Яна кажа, што не хоча, каб Макарчык вырастаў так хутка. А я, наадварот. Ну што мне з той лялечкі? Іра, бабуля і Насця (Ірына дачка ад першага шлюбу) расчульваюцца: «усі-пусі». А мне што з таго? Я люблю, каб сын хадзіў са мной некуды. Спрабую браць на працу. Але пакуль толькі ў студыю. Бо апошні раз, калі мы прывялі дзяцей на рэпетыцыю, закончылася тым, што яе давялося перапыніць. Яны ж не даюць нічога рабіць: па барабанах ляпаюць, шнуры выдзіраюць.



**За спінай дзіцяці, перакананы, павінны стаяць продкі па мужчынскай лініі — бацька, дзед, прадзед, якіх ты паважаеш. Вельмі дрэнна, калі гэтыя сувязі разарваныя.**

***— Бачыце ў ім музыку?***

— Пакуль не. Ён любіць пастукаць па барабанах ды пакрычаць, як і ўсе дзеці ў яго ўзросце. А вось спяваць не. І мне забараняе. На гітары іграць таксама. Штосьці яму не падабаецца. Я бяру гітару. А ён: «Тата, не. Не трэба». Вось пальчатку баксёрскую маю надзець — гэта яму больш даспадобы. Узрост такі, характар пачынае праяўляцца. Макар у нас вельмі камунікабельны. Вельмі хоча ў садзік. Вырашылі, што аддадзім у тры гады.

***— Не баіцеся, што нечаму дрэннаму навучыцца ў іншых дзяцей?***

— Нічога страшнага. Хлопец усё ж такі. Трэба ж імунітэт выпрацоўваць. У мяне ёсць сябар, які дачку вадзіў у прыватны дзіцячы сад. Там усе дзеці былі, як на падбор — выхаваныя, спакойныя. Калі пераехалі жыць у іншы канец горада, стала далёка вазіць, таму аддалі ў бліжэйшы сад. У першы ж дзень дзяўчынку давялі да істэрыкі. Але затое ёй пасля стала прасцей ісці ў школу. Лічу, што добра, калі ў садзіку ёсць хоць адзін забіяка, каб іншыя дзеці разумелі, як з гэтым жыць.

***— Як, дарэчы, складваюцца адносіны з Ірынай дачкой?***

— Я для яе сябар, «чувак», да якога яна добра ставіцца. Насця цяпер у такім узросце, калі хочацца тусіць, часта ездзіць на розныя канцэрты. Мне нешта паказвае, пытаецца, раіцца. Я ж «сяку» ў тэме *(смяецца)*.

***— Татам яна вас не называе?***

— Не. У яе добрыя адносіны са сваім татам. Калі ён у яе пытаўся пра мяне, Насця сказала: «Гэта вельмі добры чувак». Ёй тады было гадоў 11. Цяпер жа яна ўжо вучыцца ў інстытуце.

## «Нельга «баніць» дзіця»

***— Як вы ставіцеся да адкрытага праяўлення эмоцый? Часта кажаце Макару, што вы яго любіце?***

— У маёй сям'і эмоцый практычна не было. Мама яшчэ больш-менш. А вось бацька наогул сваіх пачуццяў ніяк не праяўляў. Я ж лічу, што калі хочацца, трэба, абавязкова праяўляць. Каб дзіця адчувала, што яго любяць. Калі Макару штосьці не падабаецца, ён жа ў сабе гэта не трымае. Нельга стрымліваць, бо гэта пасля вылезе вельмі моцна бокам. Штосьці не падабаецца — скажы. Штосьці падабаецца — пакажы. Трэба ўсе свае адчуванні праяўляць. Гэта вельмі важна. Я гэта ўжо ведаю, таму Макар расце ў іншым асяродку.

*(Макар дастаў каробку і высыпаў усе пазлы на падлогу).*

— Вось так мы любім рабіць *(смяецца Валерый)*. Ну давай цяпер разам будзем збіраць...

***— Якіх прынцыпаў прытрымліваецеся ў выхаванні?***

— Я — савецкае дзіця. Хто там глядзеў, што я адчуваю, чаго я хачу? «Не хадзі, не лезь» — вось гэта я чуў пастаянна. Памятаю, калі мне было 10 гадоў, захацеў пайсці на ушу. Сказаў пра гэта маме. «Ты што, не хадзі! Галаву адаб'юць там, не дай бог, зубы павыбіваюць». Я рос са страхам унутры, з кучай комплексаў... У нас такога няма і не будзе. Мы Макару нічога не забараняем. Не крычым на яго. Калі шчыра, у мяне па першым часе таксама вырывалася па інерцыі «нельга», але я сябе спыняў пастаянна. Што б Макар ні зрабіў, я заўсёды яго хвалю. Таму што калі ты яго хваліш, ён расце ўпэўненым, не зацюканым.

***— У маці і таты пэўна, розныя падыходы да выхавання. Як вы супакойваеце сына, калі ён плача?***

— Іра кажа: «Хочаш плакаць, плач. Яшчэ мацней». Ён: «Не, не буду». А я проста адцягваю ўвагу, пераключаю на нешта іншае, больш цікавае. Тое ж самае і з планшэтам. Як яму забараніць ім карыстацца? Нельга забараняць, трэба проста паказаць іншыя магчымасці. Вось споўніцца яму 5 гадоў, абавязкова аддам на бокс. Па-першае, ён будзе заняты. Па другое, у чалавека, які займаецца спортам, не важна якім, з дзяцінства выпрацоўваецца характар. Нешта баліць, не хачу, лянота, але трэба. У арміі са мной служыў чэмпіён рэспублікі па весламанні. Я зразумеў, што спорт даў яму, акрамя шырокіх плячэй, спакой і ўпэўненасць у сабе. Акрамя бокса, прапануем яму нейкія развіваючыя гурткі. Каб не было вольнага часу ў планшэт «тупіць» ды па падвалах лазіць.

***— Знаёмы даў свой першы верш тату пачытаць, а ён пачаў смяяцца: «Ты Ясеніна лепш пачытай...»***

— Нельга так казаць, ні ў якім разе — гэта сур'ёзная траўма. Мае бацькі не хацелі, каб я музыкай займаўся. Я сам пайшоў у музычную школу, адзін. Папрасіўся, каб мяне ўзялі. Тое ж было і з музычным вучылішчам. Здаў іспыт і паступіў. Мае бацькі — простыя людзі, хацелі, каб я быў майстрам-тэхнолагам, займаўся вытворчасцю каўбас, пячэння, макаронаў. Каб я заўсёды быў пры ежы. Казалі: *«Валера, ну зачэм табе ўся гэтая музыка?»* Я ж нікога не слухаў.

***— Вы не слухалі, а нехта б мог паслухацць і пасля пашкадаваць...***

— Усе мае школьныя сябры слухалі. Ну і цяпер... Я не ведаю, чым яны займаюцца. Таксама было і ў музычным вучылішчы. Большасць музыкай не займаюцца. Проста нехта палічыў, што ім трэба туды пайсці, і не важна, хацелася ім, ці не. Гэта адразу відаць. Таму нельга ні ў якім разе так «баніць» дзіця.

***— Як вы лічыце, калі жанчына выхоўвае сына адна, з'яўляецца пагроза, што гэта будзе чарговы распешчаны «мамчын сынок»?***

— Многія рэчы здольны даць толькі тата. Ніхто ніколі яго не заменіць. Плюс у хлопчыкаў, якіх тата альбо недалюбіў, альбо быў жорсткім, альбо наогул яго не было, вельмі шмат комплексаў. За спінай дзіцяці, перакананы, павінны стаяць продкі па мужчынскай лініі — бацька, дзед, прадзед, якіх ты паважаеш. Ты павінен адчуваць, што ты не адзін. Вельмі дрэнна, калі гэтыя сувязі разарваныя.

***— Усе, хто супраць, каб бацька сядзеў у дэкрэце, аргументуюць сваё меркаванне тым, што да трох гадоў дзіцяці абавязкова патрэбна мама, а не тата?***

— Маці канешне патрэбна, бо ў іх сувязь асобая, нават на фізіялагічным узроўні. Менавіта таму ў жыцці Макарчыка Іры не менш, чым мяне. Гэта ж не тое, што я сеў у дэкрэце і сяджу. Я ж пасляваю і грошы зарабляць. Часам а трэцяй гадзіне ночы пасля карпаратыву вяртаўся. А Іра сыходзіць на работу ў 9 раніцы. 3-4 гадзіны паспаў і «гуляй тата». Павінны быць і мама, і тата, на аднолькавых ролях. Я не разумею, як дзяўчаты нараджаюць і пасля гадуюць дзіця ў адзіноце. Гэта ж можна звар'яцець. Я бачу такіх адзінокіх матуль (прычым, у многіх з іх ёсць муж, але ён ці выпівае, ці ігнаруе і не дапамагае). «Гора-тата» не разумее (ці не хоча разумець), што адбываецца. А гэтую няшчасную маці адразу бачна. У яе такі погляд — ніякі, яна перастае сачыць за сабой, бо няма калі гэтым займацца. Вось табе і сядзіць маці ў дэкрэце да трох гадоў. І які сэнс? Каб была маці, трэба, каб быў і тата.

***P.S.*** *З мамай Макара нам усё ж такі таксама пашчасціла пазнаёміцца. У 13.08 з ліфта, які мы выклікалі, выйшла Ірына (пазналі па фотаздымках, што бачылі на сценах кватэры). Яна вельмі спяшалася на абед, каб пабыць крыху з сынам.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
dryla@zviazda.by



Фота Надзеі БУЖАН.